Modern History Archives
Archiv Najnovšeje Historie
Fond . . . . . sprava B 38

# ВЕСТКІ

вайкавыскіх сяброў БНФ
"Адраджэньне"

№ 1 • лістапад 1990 г. • кошт 50 к.

Шаноўны чытач ! Перад ВамІ — першы нумар першай ваўкавыскай апазІцыйнай газэты . Яна , вядома не адпавядае пакуль мІжнародным узорам. Але што зробІш — магчымасьцяў у нас сёньня значна меньш, чым у афІцыйных выданьняў . ЯкІя мэты мае новая газэта ? Перш за ўсё гэта :

-- праўдзІвая Інфармацыя аб тым, пра што афІцыйны друк або ўпарта маўчыць , або пІша такую хлусьню , што разумнаму чалавеку нават чытаць сорамна ;

-- выкрыцьцё хлусьнІ наших афІцыйных Ідэолягаў / у тым лІку й ваўкавыскІх / ;

-- Інфармацыя аб дзейнасьцІ БНФ "Адраджэньне" ды Іньшых апазІцыйных таварыстваў ,арганІзацыяў , суполак -- як у Ваўкавыску , так І за яго межамІ ;

— Інфармацыя аб дзейнасьцІ дэпутацкай апазІцыІ ў горадзкІм Савеце ;

Апрача гэтага на старонках "ВЕСТАК" будуць прысутнІчаць І Іньшыя самыя разнастайныя тэмы -- гэта І гІсторыя , й эканомІка , й культура ды мастацтва , сатыра ды гумар , гандаль ды забесьпячэньне — усяго не пералІчыць ...

Але адразу зробІм невялІчкую агаворку : мы ня з тых , хто можа дазволІць сабе друкаваць кулІнарныя рэцэпты ды навІны спорту — газэта будзе мець грамадзка-палІтычны ўхІл .

Вядома , што у Вас , шаноўны чытач узьнІкае шмат пытаньняу , зьвязаных зь яе дзейнасьцю . Паспрабуем адказаць на некаторыя , як нам здаецца , найбольш натуральныя .

Магчыма , ўзьнІкне пытаньне наконт правапІсу ў беларускамоуных тэкстах : мауляу , цІ не занадта шмат памылак ? Гэта не зусІм так : справа ў тым , што мы спрабуем вярнуць той правапІс , якІ быу скалечаны у 30-ыя гады рэформаю Галадзеда ды КандыбовІча /маюцца на ўвазе такІя асаблІвасьцІ , як алІтэрацыйны мякькІ знак , перадпапІскное " я" ды Іньш./. Зараз ужо прызнана , што рэформа аказалася няўдалаю : новы правапІс зрабІў пэўны ўплыў на вымаўленьне, а у вынІку мова згубІла колІшнюю мІлагучнасьць , стаушы зь беларускай мовы "бэсэсэраускаю"...

Законнае пытаньне : чым абумоўлены такІ вялІкІ кошт ? Зразумейце нас , калІ ласка : Мы працуем зусІм у Іньшых умовах , чым афІцыйныя газэты . Паперу нам нІхто не пастауляе. Яе даводзІцца набываць , як кажуць , дзе Бог дасьць . А там кошт значна вышэйшы за дзяржауны... АналягІчна й з друкам : апазІцыйную незарэгІстраваную газэту за бясплатна нІхто друкаваць ня возьмецца . Таму зразумейця нас правІльна — нІякІя мы ня спэкулянты ...

Якая будзе пэрыядычнасьць ? На першы час мы плянуем прыкладна раз на месяц . Але трэба ўлІчыць І той факт , што гэты нумар можа быць І апошнІм . Гэта можа здарыцца з-за таго , што ВЕСТКІ не спадабаюцца чытачам . Або з-за таго, што нам скруцяць шыю тыя,каму нашая газэта стане ўпоперак горла . Але мы спадзяемся,што гэтага ня здарыцца.

Варта адзначыць І тую сумную акалІчнасьць , што газэта не зарэгІстравана . Але закону гэта не пярэчыць . Справа ў тым , што , паводле Закону аб друку , тыя выданьнІ , наклад якІх меней за тысячу , рэгІстраваць неабавязкова . А гэта дае нам магчымасьць пакуль што пачакаць з гэтаю бюракратычнай працэдураю . Вось калІ ВЕСТКІ будуць мець вялІкую аўдыторыю ... Але гэта -- ўжо другая тэма .

Як будзе распаўсюджвацца газэта ? Тут складанасьцяў болей . ПадпІску мы нажаль з-за цэлага шэрагу розных прычынаў зьдзейсьнІць ня здолеем . Таму набыць ВЕСТКІ можна будзе толькІ ў Клюбе "ДЭМАКРАТЫЧНЫ ВЫБАР" або ў грамадзкІх распаусюджвальнІкаў . Рэдакцыя распаўсюджваньнем газэты не займаецца .

Вашы водгукІ ды меркаваньнІ дасылайце , калІ ласка , на адрас :

231900 , Гародзенская вобл.
гор. Ваўкавыск , вул. СацыялІстычная , д. 13 , кв. 7 ,
Патапёнку Э. Г.

Рэдакцыя таксама просІць прабачэньня за нІзкІ ўзровень аздабленьня й друку . Але ж зразумейце : газэта робІцца ў вольны ад працы час непрафэсІяналамІ з дапамогаю саматужных "тэхналёгІяў" .

Спадзяемся , што гэты "першы блІн" ня будзе "камяком"...

## СЁНЬНЯ У НУМАРЫ:

СТ. 2

"Наступствы адной сустрэчы"-- аб тым , як дэпутаты з Клюбу "Дэмакратычны выбар" сустрэлІся з выбаршчыкамІ І што з гэтага атрымалася.

"История с демонстрацией" — почему волковычан всё-таки согнали на площадь 07.X.90

СТ. 3

"Семдзесят пятая" — як праходзІлІ выбары ў бальнІцы -- семдзесят пятай выбарчай акрузе .

СТ. 4-5

"НататкІ пра сымболІ" -- гэрб Ваукавыска -- якІ ён на самой справе ?



СТ. 7

"Что дальше ?" — о том , что мы имеем после выборов и как из этого выскребаться .

СТ. 8

Р О З Н А Е — абвесткІ , Інфармацыя .

# НАСТУПСТВЫ АДНОЙ СУСТРЭЧЫ

Сустрэча, абь якой пойдзе гаворка, адбылася 28-га кастрычнIка ў ГДК. Гэта была першая спроба справаздачы перад выбаршчыкамI дэпутатаў, якIя прадстауляюць у гарадзкIм, абласным ды Вярхоуным Саветах Клюб "Дэмакратычны выбар" ды БНФ. Гэта была спроба даць адказ на пытаньне : "Куды падзелIся "нефармалы", што нарабIлI столькI шуму падчас выбараў ?"

Вядома, не зусIм звыкла гэта ў Ваўкавыску -- хваля мIтынгаў ды акцый пратэсту не кранула пакуль наш горад.

Натуральна, што ня усё атрымалася так, як варта было б -- няма ў нас яшчэ вопыту такIх сустрэч, ды й прамовы ў нас атрымлIваюцца не такIмI прыгожымI, як у партыйных функцыянэраў. Зразумела, што й сказаць мы пасьпелI далёка ня ўсё з таго, што жадалI. Нават ня гледзячы на тое, што сустрэча зацягнулася на чатыры з паловаю гадзIны !.. Красамоўная акалIчнасьць : людзI, што прыйшлI на яе, ня скардзIлIся потым на працягласьць. Дзякуй усIм тым, хто быў у зале. Шчыры дзякуй тым, хто ахвяравау вольным часам ды наведаў у той дзень ГДК !

Трэба адзначыць, што сустрэча прайшла нават лепш, чым мы спадзявалIся. Зала ставIлася да дэпутацкай групы К"Д.в."/БНФ надзвычай дабразычлIва. ЛюдзI падтрымалI нас, а не гарадзкую партакратыю...

А што потым ? А потым пачалася другая гIсторыя : спроба рэваншу з боку нашых апанентаў. I трэба сказаць, не найлепшым чынам. Першаю "ластаўкаю" быў артыкул пад назваю "Ад Варкуты да вулIцы Паўднёвай" /"Знамя Октября",30"X"90г./. Што казаць пра яго ? Аутар убачыў у зале тое, што ЖАДАЎ УБАЧЫЦЬ. А потым падаў гэта у тым выглядзе, што патрэбны гаркаму КПБ. Чаго вартыя, напрыклад такIя радкI: "...как может один депутат..давать оценку...:"Зайцев -- самый непопулярный руководитель в городе. То, что он -- депутат горсовета -- возмутительный факт"... Прабачце, паважаны МIкалай МIкалаявIч, але магу запэўнIць Вас, што пад гэтымI словамI падпIшуцца, бадай што, 90% жыхароу гораду ! А навошта тузаць факты, падганяючы ход падзеяў пад сваё меркаваньне ?! Вы пIшаце, што падчас прамовы I. Цыбульскага людзI пачалI выходзIць з залы, што ён "...битых полчаса рассказывал, что забастовка началась не I3-го, а II-го..." Дык вы ж нIчога ня чулI, калI так : нI пра дачыненьне да шахцёрскIх страйкаў Андрэя Сахарава, нI пра сувязI страйкавых камIтэтаў з шахцёрамI АнглII. А што тычыцца выхаду з залы, дык глядзець трэба было ўважлIва : прысутныя выходзIлI /нават групамI/ менавIта падчас прамовы У. ЛукашэвIча, якога, калI верыць Вам, усе слухалI "...с напряжённым вниманием..." Наконт зьместу гэтага артыкулу можна сказаць адно: аўтар меў мэтаю, чаго б гэта не каштавала, паказаць : дэпутацкая апазIцыя ў ВаукавыскIм гарадзкIм Савеце -- пустазвоны, якIя ня маюць анIякае падтрымкI... ДамаглIся Вы гэтага, цI не -- час пакажа.

Але ж рэванш на гэтым не павIнен спынIцца ! I вось ужо наладжваяцца сход дэпутатаў, дзе мае адбыцца абмеркаваньне "поведения группы депутатов". Ну, вядома ж : як безь яго ?! I сход адбыўся. Было выкарыстана ўсё: ад тонкага ператузваньня фактаў да непрыкрытае хлусьнI. Чаго вартае, напрыклад, такое абвIнавачваньне : чаму не пасадзIлI ў прэзIдыюм нас -- старшыню Савету ды старшыню выканкаму ?!

Вось так : нават не зразумелI таго, што на сцэне быў не ганаровы прэзIдыюм, а проста дэпутаты апазIцыйнае групы...

БылI шматлIкIя абвIнавачваньнI, што мы "клевещем" ды "оскорбляем". Прабачце калI ласка, шаноўныя апаненты, але ж сярод вас ёсьць людзI зь юрыдычнаю адукацыяй ! КалI яны вам гэтага не растлумачылI, дык паслухайце, калI ласка, нас : у выпадку наяўнасьцI ў нашых дзеяньнях складу злачынства, што трапляе пад артыкул I28-мы КрымIнальнага кодэксу /паклёп/ або I29-ты /абраза/, зьвяртайцеся ў суд, не апялюючы да дэпутатаў. Але асноўнае наша "злачынства" -- ў тым, што мы нIбыта падаем дзейнасьць Савету ў скажоным ды падтасаваным выглядзе.

Ну, што ж, калI вы лIчыце, нIбыта гарадзкI Савет /а таксама й вышэйстаячыя/ прынесьлI ў гэтым склIканьнI шмат карысьцI, дык заставайцеся пры сваIх асабIстых думках...

Як заусёды ў такIх выпадках, сход прыняў адкрытым галасаваньнем пэўнае рашэньне. Якоя ж ? А вось такоя : трэба дамагацца нечарговае сэсII. Па-першае, на ёй трэба вырашыць пытаньне наконт М. Кавальчука, якI ня мае пасьля такIх падзей анIякага права быць намесьнIкам старшынI. А па-другоя : трэба ж нешта рабIць з гэтаю непаслухмянаю апазIцыяй...

Але менавIта тут I ўзьнIкаюць цяжкасьцI. Справа ў тым, што думка аб нечарговай сэсII прыйшлася даспадобы й нам : надышоў час высьвятляць пытаньне наконт старшынI, якI нIбыта ёсьць, нIбыта яго няма. А з гэтага вынIкае : паводле Рэглямэнту, давядзецца сёньняшняму старшынI або складаць паўнамоцтвы, або пераходзIць працаваць у Савет. ТакIм чынам, невядома, каму горш будзя ад такога павароту.

Справа зь нечарговаю сэсIяй з такое нагоды пакуль прыпынена. Але адно вызначана канчаткова : ў наступны раз такую сустрэчу нам правесьцI будзя значна цяжэй. Дзеля таго, каб яе прадухIлIць ёсьць шмат бюракратычных мэтадаў. Дарэчы, гэта была адна з прычын, што прымусIлI нас стварыць сваю газэту...

Э. Патапёнак.

# история с демонстрацией.

Сегодня стало модным рассуждать о том, что, с отменой пресловутой шестой статьи, исчез партийный диктат. Ибо теперь партийные органы совершенно не вмешиваются, да и не имеют права вмешиваться, в дела государственных органов. Давайте посмотрим, как это выглядит на деле.

Демонстрация 7-го ноября была в центре внимания уже давно. Наконец и в Волковыск достучалось понимание того, насколько нелепо сгонять на площадь народ в добровольно-принудительном порядке. Причём только ради того, дабы отпраздновать очередную годовщину Октябрьского переворота...

Президиум Волковысского городского Совета принимает решение : демонстрацию 7-го ноября не проводить. Вместо неё провести митинг. Решение было разумним : нет демонстрации -- нет и "праздничных" колонн. А раз так, то нет и "обязаловки", т.е. добровольно-принудительной явки. Не доведётся мёрзнуть на площади ради того, чтобы пройтись перед "отцами города", стоящими на праздничной трибуне.

/ Окончание на стр. 7 /

20-га стагоддзя ? Чаму зьяв-
вІлася пІльная патрэба на-
даць гораду новы гэрб ? . А
не было нІякай патрэбы. Уся
справа ў тым,што зьмена сы-
мболIкI увайшла ў моду.Той
жа беларускI сьцяг мяняўся
падчас савецкае ўлады двой-
чы:спачатку зь бел-чырвона-
белага зрабІлІ чырвоны зь
белым арнамэнтам . Потым да
яго чамусьцІ прыляпІлІ зя-
лёную паласу /зялёны штан-
дар Ісламу ?!/.Зьмянiўся й
гэрб БеларусI . ЗьмянIлIся
назвы /напр: Менск—Мінск ,
Гомля—Гомель/. Навошта ?
ВельмI проста . Амаль як у
"Інтэрнацыянале":"Мы сьвет
на новы лад збудуем !!!" Ну
й будавалI...БудавалI,выра-
каючыся ўсяго,што было да
Іняе "будоулI"...
Памятаеце,з падручнІка па
гІсторыI : "Сапраўдны рос-
квІт навукI пачаўся толькI
пасьля ВялIкай КастрычнІц -
кай рэвалюцыI...СапраўднымI
людзямI мы зрабIлIся толькI
пасьля рэвалюцыI...Сапраўд-
ны пад"ём прамысловасьцI ў
нас пачаўся толькI пасьля..
сапраўдны росквIт культуры,
мастацтваў...ТОЛЬКI ПАСЬЛЯ.
..пасьля...пасьля"...
Часам мне здаецца,што— як
дай бальшавIкам волю —яны
б ня толькI гIсторыю — а
нават БIблIю перапIсалI б!
НапIсалI б як вызвалены ка-
мIсарамI ад панскага прыг-
нёту Бог стварыў Зямлю ды
неба пасьля...чаго ?Ну,зра-
зумела — пасьля ВялIкай
КастрычнIцкай сацыялIстыч -
най рэвалюцыI !..



Адна з выяў гэрбу "Пагоня" .

А калI гэтак, дык не было
папярэдняе гIсторыI . Можна
даваць новыя назвы ды ўтва-
раць новыя гэрбы,не зважаю-
чы на старыя...Зразумела ,
што ў гэты струмень трапIла
й тагачаснае кIраўнIцтва на-
шага гораду. I што ў вынIку
атрымалася ? Эмблема . Ды й
ня вельмI разумная . ЗIрнем
на яе больш уважлIва.
Пад лапамI ваўка — лIчба
"1252",якая сымбалIзуе "год
нараджэньня"Ваўкавыску. ЦI-
кава...Ды дзе ж вы бачылI ,
каб год заснаваньня ў гэрб
упIсваўся ? НI ў адной цы-
вIлIзаванай краIне так не
рабIлI.Хаця, чаму тут дзI -
вIцца — мы ж не цывIлIза -
ваная краIна ! /Лепш бы ўжо
подпIс "мастака" паставIлI:
больш асэнсаваным малюнак
не зрабIўся б,але мы ведалI
б,каму "дзякаваць"/




А чым абгрунтаваны падзел
поля на дзьве часткI ? З
70-цI вывучаных на сёньня
гэрбаў толькI тры маюць
падзеленае поле. У двух вы-
падках /ЛIда,Ашмяны/ гэта
тлумачыцца жаданьнем увесьцI
элямэнты Іншых гэрбаў , а ў
трэцIм /НясьвIж/ наяўнасьцю
врубаў*. Якая патрэба была
прарабляць гэта ў Ваўкавыс-
ку ? Што — горад належыць
МIнмашбуду,сымболь якога —
шэсьцярня ?! ЦI па тарчаI
бIлI коласам,ды так,што за-
стаўся сьлед ад удару? Та-
кIм чынам, падзел поля /на-
огул не характэрны у Бела-
русI/ нIчым не абгрунтава -
ны.
Што ж да колераў,дык тут
наогул няма чым крыць.Існу-
ючыя законы гэральдыкI за -



НясьвIж .

бараняюць непасрэдна спа-
лучаць чырвоны колер зь зя-
лёным. Але ж апрача гэтых
законаў ёсьць завядзёнка ,
паводле якой дурасьць вышэй-
стаячага кIраўнIцтва усIмI
астатнIмI павIнна паўтарац-
ца штодзённа. Ёсьць у нас
сьцяг БССР,якI не адпавядае
памянёнаму правIлу ? Ёсьць.
Ну дык давайце выкарыстаем
гэтыя колеры ў ВаўкавыскIм
гэрбе — праявIм прыхIль- -
насьць дурасьцI вышэйстаячых
кIраўнIкоў...Неадукавана ?!
Затое Iдэйна !!!
У нIжняй палове — шэсь -
цярня. А чаму,ўласна кажучы
ня назва заводу ? Спрадвеку
род занятка гараджан сым-
балIзаваўся нейкIмI ускос-
нымI шляхамI. Але нам гэта
навошта ? Мы вось так, про-
ста у лоб — па-бальшавIцку.
НекалI паказалI па тэле-
бачаньнI гутарку гIсторыкаў
на тэму гэральдыкI. Дык там
шмат сьмяялIся з аналягIч -
нага выпадку. ТолькI замест
шэсьцярнI фIгурыравау кран
са струменем — у гонар не-
йкага хIмпрадпрыемства ...
Дзякаваць Богу, што яны пра
Ваўкавыск ня ведалI. /ЦIка-
ва,што нам рабIцькалI зача-
хне у горадзе машынабудава-
ньне ? Мяняць гэрб ? Дык цI
ў апошнI раз ?!/
Там жа, ў нIжняй палове -
— колас. Навошта ? Што —
на тэрыторыI Ваўкавыску жы-
та сеюць ? ЦI большасьць
гараджанаў — хлебаробы ?..
Падсумуем:
I/ Зьмена гэрбу бязь пIль -
нае патрэбы;
2/ Наяўнасьць у малюнку лI-
чбаў;
3/ Неабгрунтаваны падзел по-
ля на дзьве часткI;
4/ Спалучэньне чырвонага ко-
леру зь зялёным;
5/ Бязглуздая шэсьцярня;
6/ Недарэчны колас.
Мо хопIць ? На адной руцэ
пальцаў ужо мала.
Каб быць да канца абьек -
тыўным, варта адзначыць,што
ёсьць гэрбы,выкананыя з па-
рушэньнем традыцыяў. Але ў
Iх — максIмум адна недарэ-
чнасьць. КалI болей — гэрб
ня мае права Iснаваць.
А ў нас Iх колькI ? Шэсьць.
ТакIм чынам,тое,што сёнь-
ня лIчыцца сымболем нашага
гораду — гэта сьцяг бяз-
глуздзIцы. I здатны ён хIба
толькI на тое,каб быць эмб-
лемаю гаркаму або выканкаму
— ў залежнасьцI ад таго ,
дзе ён "нарадзIўся".На доў-
гую памяць аб тым, якIя не-
адукаваныя, нават непIсьме-
нныя людзI там трапляюцца ,
А пакуль што... Ведаеце,
як у тэатры падчас прэм"е -
ры :

— Аўтара на сцэну !!!
— Аў-та-ра !!!
А й сапраўды цIкава : хто
аўтар гэтага "гэрбу" ?..

Ад рэдакцыйнай групы :

пры напIсаньнI былI выка-
рыстаныя некаторыя матэры-
ялы /у прыватнасьцI , ма-
люнкI/з кнIгI А. ЦIтова
"Гарадзкая гэральдыка
БеларусI"

* Вруб — у гэральдыцы — паласа , якая нIбыта застала-
ся на тарчаI пасьля удару па ёй мячом або баявою
сякерай .

# МАРКСІЗМ – ТЭОРЫЯ АБСУРДУ

**Аляксандр ЦЫПКО, былы кансультант ЦК КПСС, прыцягнуў да сябе ўвагу ў 1988 годзе. Тады ён надрукаваў шэраг артыкулаў пад назваю "ВытокІ сталІнІзму", дзе разглядалІся праблемы савецкага грамадзтва — ад КастрычнІцкай рэвалюцыІ да гарбачоўскага пэрыяду. Прапануем чытачам зьмешчанае ў газэце "Советская молодёжь"/СМ,Рыга/ Інтэрв"ю, дадзенае Аляксандрам Цыпко карэспандэнту амэрыканскага часопІсу "НьюсуІк". /СМ, 16-га кастр., 1990 г. /**

На Захадзе хто-кольвечы лІчыць марксІзм састарэлаю тэорыяй. Якую ролю, на ваш погляд, адыгрывае гэтая Ідэалёгія ў савецкІм грамадзтве ?

— Дзеля ленІнскае групы, ў тым лІку СталІна ды Троцкага, марксІзм быў баявою зброяй. СавецкІя кІраўнІкІ больш позьняга часу з-за нІзкага узроўню сваёй палІтычнае адукацыІ ператварылІ марксІзм у догму. Брэжнеў, Суслаў ды Андропаў былІ неверагодна цынІчныя, асаблІва Андропаў — вельмІ адукаваны, разумны чалавек — добра разумеў, што гэтая Ідэалёгія неабходная дзеля захаваньня ўлады. Дзеля кантролю над грамадзтвам.

Нядаўна Вы напІсалІ :"МарксІсцкая Ідэалёгія пакІдае камунІстам увесь час скакаць у басэйн без вады".
ЦІ значыць гэта, што марксІзм — мертвы ?

— Нажаль не. МарксІзм — гэта хворае, Ілюзорнае успрыняцьце рэчаІснасьцІ капІталІстычнага ладу. Ён зьявІуся ў сярэдзІне XIX стагоддзя як рэакцыя на рэзкІ кантраст мІж багацьцём ды галечаю. Я лІчу, што гэта — Ідэалёгія "крайнІх"— людзей, ня здолеушых адаптавацца у грамадзтве ды ня здольных пераадолець цяжкасьцІ нармалёвым цывІлІзаваным спосабам.

СавецкІя кансэрватары сапрауды верацЬ у марксІзм ?

— Гэта вельмІ цяжкае пытаньне. ШматлІкІя дагматыкІ зусІм ня здольныя зразумець усёй складанасьцІ сучаснага сьвету, а таму намагаюцца навязаць людзям прымІтыўныя схэмы марксІзму. Іншыя зьяуляюцца проста гультаяватымІ, малаадукаванымІ й ня маюць Іньшага шанцу вылучыцца, чым як толькІ праз камунІстычную партыю. ТакІя людзІ й чапляюцца за сацыялІзм — лад гультаёў ды бюракратаў.

Нядаўна я сустракауся з амэрыканскІмІ марксІстамІ й быў, варта сказаць, вельмІ ды вельмІ зьдзІўлены. Яны успрымаюць сьвет толькІ ў чорна-белых колерах. АмэрыканскІя пасьлядоунІкІ Маркса лІчаць, што заходняе грамадзтва эксплуатуе людзей, а таму сацыялІстычны лад лепш. КалІ Ім спрабуеш тлумачыць, што эксплуатацыя пры сацыялІзме значна цяжэй, яны гэтага не разумеюць... Яны цалкам падобныя на заснавальнІка вучэньня : Маркс таксама бачыў у навакольнай рэчаІснасьцІ толькІ тыя гІстарычныя праблемы, што падыходзІлІ пад яго схэму, а Іньшых ён не заўважаў.

А як наконт "раньняга" Маркса ды яго акцэнтаў на агульначалавечыя каштоўнасьцІ?

— Спачатку я лІчыў "раньняга" Маркса гуманІстам, але потым зразумеў, што самы небясьпечны Маркс — той самы "раньнІ". Ён нападае на правы ды вольнасьцІ асобы, ён супраць хрысьцІянскае недатыкальнасьцІ кожнага. Маркс быў гэнІяльным мысьлІўцам, але душа яго была мертвая.

Як Вы ставІцеся да новай ІнтэрпрэтацыІ гІсторыІ Савецкага Саюзу ?

— "НэамарксІсты" Отта Лацыс, Юрый Афанасьеў — маюць Ілюзію, што, выкрываючы СталІна, магчыма абялІць "ленІнскую гвардыю" ды захаваць у людзях павагу да "гуманнай" рэвалюцыІ, да Ідэалау КастрычнІка.

Але разумны чалавек, дазнаўшыся пра злачынствы СталІна, пачынае разумець, што й астатнІя "правадыры" мала чым адрозьнівалІся ад тырана. Погляд з агульначалавечых, хрысьцІянскІх пазІцыяў прымушае задумацца : цІ каштавала"сьветлая будучыня" семдзесят мІльёнау жыцьцяў?

Але што здолее замянІць камунІстычную Ідэалёгію ? Вы заклІкалІ вярнуцца да расейскае культуры ды гІсторыІ, да Царквы, "гІстарычнае памяцІ ды веры".ЦІ не падобна гэта на лёзунг ультраправага нацыяналІста ?

— Магчыма, але прашу ўлІчыць, што казаў я гэта як дэмакрат. Мая канцэпцыя адраджэньня дэмакратычнай РасеІ — гэта не "РАСЕЯ ДЗЕЛЯ РАСЕЙЦАУ". Вольныя людзІ маюць права спавядаць сваю рэлІгію, й адна з умоў перабудовы — адраджэньне Царквы. Але артадаксальная Царква абьяднае ўсе славянскІя народы.

Але ня усе народы ПрыбалтыкІ, Сярэдняе АзІІ ды Каўказу.ЦІ не прывядзе адраджэньне расейскае нацыянальнае самасьвядомасьцІ да краху ІмпэрыІ ?

— Я перакананы, што калІ Расея здолела б уваскрэсІць сваю культуру, рэлІгію, традыцыІ — шанцы захаваць СавецкІ Саюз у цэласьцІ павялІчылІся б разоў у дзесятак. ЛюдзІ бягуць ад абсурднае ІдэалёгІІ, ад некампетэнтнага ўраду, ад тых агрэсІўных грубІянаў, якІх мы бачылІ на 28-ым зьезьдзе КПСС. Дзеля Эўропы ды ўсяго сьвету вельмІ важна каб Расея была культурнай, цывІлІзаванай краІнай, якая адмовІлася ад свайго "месІянства" — навязваньня сацыялІстычнага ладу жыцьця.

Але ў СССР ужо Існуе апазІцыя ...

— Трагедыя Савецкага Саюзу ў тым, што нават апазІцыянэры тут — таксама марксІсты. Яны змагаюцца за палІтычныя пасады, ужываючы нягодную тактыку — палІтыку лявІзны.

Што Вы думаеце пра пэрспэктывы разьвІцьця марксІзму ?

— Іх проста няма.

/ ІМА-прэс — па матэр"ялах часопІсу "НьюсуІк" /

Замежны гумар, або ВЕСТКІ з-за кардону




"Новы дзІкабраз"/Прага/ № 16, 1990 г.

# История с демонстрацией

Начало см. стр. 2.

Но есть у демонстрации и другая сторона — амбиции горкома КПБ ... Действительно — как это на Беларуси — заповеднике "социалистического выбора" — и вдруг без демонстрации ?!

Как отменить решение Президиума ? Элементарно ! Для этого проводится совместное заседание президиумов городского и районного Советов и горкома компартии . Короче — задавим массовостью ! Решение было принято . То, которое требовалось сторонникам "твёрдого курса" .

А теперь попробуем взглянуть на всё это беспристрастно .

Первое . Городской Совет районному не подчинён и не подотчётен . Демонстрация имеет состояться /либо — не состояться/ в городе , т. е. на территориии городского, а не районного Совета . А значит , решать судьбу демонстрации должен городской Совет — районный к этому не имеет никакого отношения . Вопрос: зачем понадобилось совместное заседание ? Ответ удивительно прост : в президиуме районного Совета больше "послушных" горкому депутатов .

Второе . Как может президиум Совета , т.е. орган государственной власти принимать решение совместно с горкомом КПБ , т.е. органом общественно-политической организации ? Особенно в свете того , что в составах обоих президиумов преобладающая часть — члены КПБ/КПСС .Вот она — старая песня под названием "партия и правительство решили" !

Третье . В силу того , что в голосовании принимали участие люди , не имеющие на то права , данное решение является неправомочным . А раз так , то остаётся в силе первое решение Президиума горсовета /"демонстрацию не проводить"/. Следовательно демонстрация 7.Х.90 г. — прямое нарушение ...

Но что это значит , когда речь идёт об амбициях КПБ !

Такая вот получилась история с демонстрацией . Ничего нового — просто лишнее подтверждение тому , что партия когда-то узурпировавшая власть , делиться ею пока не собирается ни с кем .

# ЧТО ДАЛЬШЕ?

Итак, выборы закончились . Причём , давно . Настало время оглянуться : что нам дали Советы в новом составе ? Ничего . Попробуем разобраться , почему так случилось , ибо истина "так жить нельзя" уже успела стать тривиальной .

Состав Советов всех уровней по всей Белоруссии примерно одинаков : большинство в них — те же представители нашей бюрократической , партийно-номенклатурной братии , что и раньше . Да ещё их подпевалы разного калибра . Представители оппозиции — БНФ и другие движения , которые входили в блок "Советы-90", сегодня имеют меньшинство . Почему так получилось ? Причин много . Аппарат использовал всё — все имеющиеся возможности . Пожалуй , вторая , не менее серьёзная причина — это то , что народ был ещё недостаточно подготовлен к выборной кампании — люди устали от выборов , не сознавая , что единственный шанс что-то изменить — это держаться "до последнего", вычёркивая предлагаемых партократией кандидатов . В частности , у нас в Волковыске избиратели остановились на двух турах . Третья из причин — недостаточная информированность . Не зря печать называют "четвёртой властью" — в условиях , когда ВСЕ средства информации монополизированы в руках одной партии , трудно донести до народа правду .

Итак , что мы имеем сегодня ? Простой арифметический перевес в количестве голосов позволяет торпедировать любую попытку добиться каких-либо изменений . В качестве примера можно взять хотя бы Верховный Совет БССР,благо , трансляции с его сессий — дело доступное . Тот , кто видел первую сессию , тот имел возможность наблюдать , как порой круто менялся её ход . Всем известно , как непримиримо относилась группировка Соколова - Дементея к идее независимости . Но вот Николая Ивановича вызывают в Москву"на инструктаж". И что же ? По возвращении он неожиданно становится одним из наиболее твёрдых сторонников принятия Декларации о суверенитете. Иными словами : Москва приказала,— и Дементей сразу стал суверенным . Точно такими же стали и все те , кто раньше готов, казалось, "волком выгрызти суверенитет. Но что толку ?

На что нам сегодня суверенитет ? Дело в том , что другие республики принимали его затем, чтобы иметь хотя бы моральное право на принятие решений ,противоречащих указаниям центра. А что у нас ? А у нас , пожалуй , только чихнуть могут , не спросив разрешения вышестоящих органов . И то не более одного раза...

Точно такая же картина и во всех остальных Советах , абсолютно все они занимаются исключительно ратификацией решений , принятых "более компетентными" органами. Как говорится, " шаг влево , шаг вправо считается побегом" . Ждать чего-либо от таких Советов — бессмысленно .

Часто можно слышать : "Ну,выбрали мы Сидорова /Петрова,Степанова,Ибрагимова/ — а что толку. Колбасы-то в магазинах всё равно нет..." Да , её нет . И не будет . Потому , что один /два,пять,десять/ депутат , пускай он даже самый прогрессивный , сделать ничего не сможет из-за всё того же пресловутого "татаро-монгольского" большинства . Просто потому , что силу закона имеет только решение сессии . А там — то самое , "татаро-монгольское"... И позиция его вполне определённая — чего сверху не приказали , того делать не буду . А "сверху" не прикажут,— там сами указаний дожидаются . Надо отдать должное — не все такие . Но иной и рад бы вразрез пойти , да при всём желании не сможет — "сверху" среагируют . И прощай должность /кресло,портфель и т.д./.

Другой аспект — работа в округе . Предположим , обратились к депутату за помощью . А что он может ? Какими правами пользуется ? Почитаешь сегодняшние нормативные акты — и диву даёшься : "имеет право обращаться","имеет право требовать","имеет право предлагать" — всё на один лад . То есть , по сути , просить в инстанциях как и частное лицо . С той только разницей , что принять его обязаны в любом случае . Закона о статусе депутата в БССР нет . Закона о самоуправлении — тоже . То есть власти , как таковой,нет . А в таких условиях можно творить что угодно . И творят . Вспомним цех фритты ...

Но ведь так продолжаться не может . Делать-то что-то надо... А что ? Есть два варианта . Первый — отозвать "татаро-монгольскую" часть депутатов . Но практически это сегодня невозможно : во первых , Закон об отзыве совершенно нежизнеспособен . Такое впечатление , что писался он с рассчётом на то , чтобы им невозможно было пользоваться . Новый Закон ещё не принят, да и не

Окончание см. стр. 8

# ЧТО ДАЛЬШЕ?

Начало см. стр. 7
скоро появится -- вспомним про всё то же большинство . Вторая причина -- низкая активность избирателей . Процедура отзыва в любом случае будет сложнее , чем выборы . Хотя , как знать...

Второй вариант , пожалуй , более приемлемый на сегодня -- это добиться роспуска ныне действующих Советов , а затем новых выборов -- уже на многопартийной основе . Как ? Это более сложный вопрос . Во всяком случае , иным способом , нежели в Армении ,Молдове и т. д. Кой-какой опыт уже есть . Это и требования шахтёров об отставке союзного правительства , и голодовки студентов на Украине . Путей много . Но упаси нас Бог от экстремизма : при любом мало-мальски подходящем случае возможно введение военного положения -- агонизирующий тоталитарный режим не остановится даже перед этим ...

Какой из этих вариантов лучше ? Пожалуй , второй. Но к таким действиям народ сегодня не готов . Ведь это -- посерьёзнее любых выборов ...

Но это -- в перспективе , хоя и в недалёкой. А что сегодня? А сегодня остаётся одно . Захват власти аппаратной партократией оставил нам только одно -- добиваться смены власти на всех уровнях . В том числе -- и путём забастовок . Кстати , о забастовках . Они есть у нас и сегодня . Но какие ? Вроде маленьких сабантуйчиков в одном отдельно взятом цеху , на одном отдельно взятом предприятии . С таких толку мало . Вспомним всё тех же шахтёров -- добиться известного 608-го постановления они смогли только после массового выступления , когда в забастовку включились не одна и не две , а десятки шахт .

Здесь уместно вспомнить Обращение Рабочего Союза Белоруссии, где говорится :

"Только наша готовность к всеобщей забастовке с требованием отставки политического руководства способна заставить его работать открыто . Именно ГОТОВНОСТЬ, а не разрозненые забастовки , -- стихийные , со множеством требований , которые делают нас ещё более беззащитными ."

Следует заметить ещё одно: требовать отставки руководства только одного уровня -- непозволительно . Тому есть много примеров : это и Россия , где демократы пришли ко власти в "верхних этажах", но их деятельность блокируется нижними эшелонами , где большинство -- у консервативно настроенного аппарата . Это и восточная Белоруссия , где в некоторых Советах демократы имеют существенную часть голосов -- там их деятельность парализуется вышестоящими соколовыми и дементеями .

Так что же всё-таки ждёт республику ? Время покажет . Пока ясно только одно -- дальше будет ещё хуже . Надеяться на нынешние Советы -- глупо .

Часто приходится слышать : "Эта "мафия" вросла в общество, причём настолько глубоко , что с ней ничего уже не сделаешь"..

Позвольте не согласиться -- сделать возможно многое . Но лишь при условии , что за это возьмётся не группа депутатов , не БНФ , не РСБ , не Клуб "Демократический выбор",наконец, а все мы -- все вместе , весь народ . Во всяком случае , ничего другого нам больше не остаётся.

Э. Потапёнок ,
депутат городского
Совета от 35-го округа .

# ВНИМАНИЕ!

Клуб "Демократический выбор" просит откликнуться владельцев печатных машинок , разделяющих наши взгляды и согласных принять участие в издании газеты и другой печатной продукции Клуба .

Просим также отозваться тех , кто имеет возможность пользоваться множительной техникой , либо имеет какие-то соображения на этот счёт. /"Ксерокс",ротапринт,принтер и т. д./

# ШЧЫРЫ ДЗЯКУЙ

УсIм тым , хто дапамог гэтаму нумару ўбачыць сьвет . Тым , хто так цI йнакш дапамог рэдакцыйнай групе -- друкам , папераю цI проста разумнаю парадаю :

спадарам зь Менску
Андрэю Рамашэўскаму ,
Алесю Сушы ,
Аляксею Шастакову ,
МIкалаю Д.,
а таксама спадарам з Ваукавыску , якIя пажадалI застацца невядомымI .

Рэдакцыйная група газэты "ВЕСТКI"

Адрас дзеля карэспандэнцый :

231900

Ваукавыск ,
вул. СацыялIстычная ,
д. 13 , кв. 7 .

# ПРАЧЫТАЎ? ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ!

ВЕСТКI
Друкарня "BieIsamizdat"

Газэта ваўкавыскIх сяброў Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" на беларускай ды расейскай мовах.
Наклад 800 асобнIкаў.

рэальна — больш за 1000

Меркаваньне аўтараў надрукаваных матэрыялаў не абавязкова супадае з пунктам гледжаньня рэдакцыйнай групы ды кIраўнIцтва БНФ. За дакладнасьць надрукаваных матэрыялаў адказваюць аўтары публIкацый